7. *Лапина, З. Г.* Учение об управлении государством в средневековом Китае / З. Г. Лапина. – М.: Наука – Гл. ред. вост. лит., 1986. – 383 с.

8. *Ши Цзе.* Чжун го лун = О Китае [Электронный ресурс] / Ши Цзе // Гу Ши Вэнь Ван. – Режим доступа: https://so.gushiwen.cn/shiwenv_944df4e557e1.aspx. – Дата доступа: 10.01.2024 (на кит. яз.).

9. История Китая с древнейших времен до начала XXI века: в 10 т. / гл. ред. С. Л. Тихвинский. Т. IV. Период Пяти династий, империя Сун, государства Ляо, Цзинь, Си Ся (907–1279) / отв. ред. И. В. Попова; Ин-т восточных рукописей РАН. – М.: Наука – Вост. лит., 2016. – 942 с.

10. Ли Ги Бек. История Кореи: новая трактовка / пер. с кор. под ред. С. О. Курбанова. – М.: ООО «Русское слово – РС», 2000. – 464 с.

**(Дата подачи: 01.02.2024 г.)**

*А. М. Загідулін*
Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Гродна

*A. Zahidulin*
Yanka Kupala State University of Grodno, Grodno

**УДК 930(470):94(438)**

# ГІСТОРЫЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1918–1939 ГГ. У ДАСЛЕДАВАННЯХ ВУЧОНЫХ ПОЛЬСКА-РАСІЙСКАЙ ГРУПЫ ПА СКЛАДАНЫХ ПЫТАННЯХ, ШТО ВЫНІКАЮЦЬ З ГІСТОРЫІ РАСІЙСКА-ПОЛЬСКІХ АДНОСІН

# HISTORY OF WESTERN BELARUS 1918–1939. IN STUDIES OF SCIENTISTS OF THE POLISH-RUSSIAN GROUP ON COMPLEX ISSUES ARISING FROM THE HISTORY OF POLISH-RUSSIAN RELATIONS[1]

*Артыкул прысвечаны дзейнасці арыгінальнага навукова-даследчага калектыву, створанага ўрадамі Расійскай Федэрацыі і Польшчы, які атрымаў назву Група па складаных пытаннях, якія вынікаюць з гісторыі расійска-польскіх адносін. У Групу ўвайшлі прафесійныя гісторыкі, архівісты Расійскай Федэрацыі і Польшчы, а таксама прадстаўнікі міністэрстваў замежных спраў, сілавых структур, урадаў дзвюх краін. Мэта дадзенага артыкула – вызначыць пытанні гісторыі Беларусі 1918–1939 гг., якія разглядаліся навукоўцамі Групы ў працэсе вывучэння расійска-польскіх адносін, і даць ім характарыстыку.*

*Ключавыя словы: гісторыя Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы 1918–1939; Група па складаных пытаннях, якія вынікаюць з гісторыі расійска-польскіх адносін; расійская гістарыяграфія; польская гістарыяграфія.*

[1] Даследаванне выканана ў межах праекта БРФФД Г23ГП–036 «Грамадска-палітычнае развіццё Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921–1939 гг.) у замежнай гістарыяграфіі».

*The article examines the activities of a temporary specific research team, which was named the Group on complex issues arising from the history of Russian-Polish relations. The Group included professional historians, archivists of the Russian Federation and Poland, as well as representatives of the ministries of foreign affairs, security forces, and governments of the two countries. The purpose of this article is to identify the issues of the history of Belarus in 1918–1939, which were considered by the scientists of the Group on complex issues arising from the history of Russian-Polish relations, and to give them a description.*

*Keywords: history of Western Belarus as part of Poland 1918–1939; Group on complex issues arising from the history of Russian-Polish relations; Russian historiography; Polish historiography.*

Тэма пытанняў гісторыі Беларусі ў сучасных сумесных расійска-польскіх даследаваннях з’яўляецца актуальнай. Пераважная большасць гістарычных падзей, заснаваных на расійска-польскім узаемадзеянні, не абыходзілася без удзелу беларусаў. Імкненне расійскіх і польскіх гісторыкаў вырашыць спрэчныя пытанні гісторыі прыводзіць да выяўлення новых фактаў, стварэння новых канцэпцый. Выявіць, якая роля адводзіцца беларусам у падзеях, кампрамісныя трактоўкі якіх імкнуцца выпрацаваць расійскія і польскія вучоныя, з’яўляецца актуальнай праблемай айчыннай гістарыяграфіі. Найбольш багатымі на факты і падзеі, а таксама спрэчнымі у рознасці трактовак з’яўляюцца польска-савецкая вайна і перыяд знаходжання Заходняй Беларусі пад польскай уладай з 1918 па 1939 г.

Аб’ект дадзенага даследавання – дзейнасць Групы па складаных пытаннях, што выцякаюць з гісторыі расійска-польскіх адносін. Прадмет даследавання – пытанні гісторыі Беларусі 1918–1939 гг., якія разглядаліся вучонымі Групы па складаных пытаннях, што вынікаюць з гісторыі расійска-польскіх адносін. Мэта даследавання – вызначыць пытанні гісторыі Беларусі 1918–1939 гг., якія разглядаліся вучонымі Групы па складаных пытаннях, што вынікаюць з гісторыі расійска-польскіх адносін, і даць ім характарыстыку. Беларуская тэматыка ў расійска-польскіх даследаваннях цікавіла беларускіх гістарыёграфаў. Яна прааналізавана шэрагам вучоных, у першую чаргу А. А. Савічам [1], А. М. Загідуліным [2].

Вывучэнне савецка-польскіх адносін у РСФСР з’яўлялася кантэкстам для даследавання пытанняў грамадска-палітычнага развіцця Заходняй Беларусі ў міжваенны час. У савецкі час у перыяд «адлігі» былі перагледжаны некаторыя спрэчныя пытанні савецка-польскіх адносін. 21 лютага 1956 г. была рэабілітавана распушчаная ў 1938 г. Камуністычная партыя Польшчы. Прыйшло ўсведамленне спрэчных палітычных сітуацый, у першую чаргу савецка-польскай войны 1919–1920 гг., і праблемы іх даследавання. У гады «застою» падтрымліваліся даследаванні, што спрыялі дружбе і супрацоўніцтву паміж СССР і ПНР. У канцы 1980-х гг. адбываецца змена парадыгм у гістарычнай навуцы. Метадалагічна плённым прынята лічыць мнагафактарны аналіз, шырокі комплексны падыход да з’яў унутранай і знешняй палітыкі. 21 красавіка 1987 г. у 42 гадавіну Дагавора аб дружбе, супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе паміж СССР і Польшчай

М. С. Гарбачовым і В. Ярузельскім была падпісана «Дэкларацыя аб савецка-польскім супрацоўніцтве ў галіне ідэалогіі, навукі і культуры» [3, с. 739]. Па выніках дамоўленасці была створана Сумесная камісія вучоных СССР і ПНР па выяўленні складаных пытанняў гісторыі савецка-польскіх адносін і сумеснай выпрацоўцы адкрытых навуковых пазіцый без скажэння ідэалагічным прымітывізмам. Пачынаючы з першага пасяджэння 19–20 мая 1987 г. было вызначана кола праблем для разгляду – 25 тэм у храналагічных рамках 1917–1945 гг. Намаганнямі камісіі і Інстытута славяназнаўства РАН праводзіцца шэраг канферэнцый, на якіх пераасэнсоўваюцца пытанні савецка-польскіх адносін [3, с. 740]. Асноўныя тэмы, якія на пераломе эпох імкнуцца пераасэнсаваць расійскія гісторыкі: катынская трагедыя, польска-савецкая вайна 1919–1920 гг., вераснёўскія падзеі 1939 г., савецка-польская дыпламатыя. У расійскай гістарыяграфіі пачынаюць адступаць ад вобраза Польшчы як «ворага № 1», знікаюць эпітэты «панская», «белапалякі», «імперыялістычная», «буржуазна-памешчыцкая» ў адносінах да Польшчы [3, с. 747].

Расійская гістарыяграфія вывучае пытанні гісторыі беларусаў у Польшчы ў 1918–1939 гг. у кантэксце савецка-польскіх адносін, польска-савецкай вайны 1919–1920 гг., заключэння Рыжскай мірнай дамовы, дзейнасці Камуністычнай партыі Польшчы і г. д. З 1990-х гг. расійскія гісторыкі пачынаюць глядзець на праблему беларусаў у складзе Польшчы ў 1920–1930-я гг. максімальна прагматычна. У гістарычных даследаваннях мы больш не ўбачым былога імкнення савецкіх гісторыкаў падтрымліваць брацкі славянскі народ, «акупаваны белапалякамі». Гістарычныя праблемы беларусаў разглядаюцца, зыходзячы з нацыянальных і дзяржаўных інтарэсаў Расіі і Савецкага Саюза. У манаграфіі І. С. Яжбароўскай і В. С. Парсаданавай «Россия и Польша. Синдром войны 1920 г.» [4] адзначаецца, што ў выніку заключэння Рыжскай мірнай дамовы новыя граніцы былі ўсталяваны часта выпадкова, насельніцтва, што трапіла ў склад Польшчы было змешаным, агульная сітуацыя была нестабільнай. Аўтары адзначалі на дадзенай тэрыторыі «пагрозу канфліктаў з боку суседа» [4, с. 28]. Пра лёс беларусаў і ўкраінцаў, што трапілі ў склад Польшчы, размова не ішла.

Польскі гісторык М. Корнат адзначае шэраг тэматычных упушчэнняў сучаснай польскай гістарыяграфіі датычна праблем гісторыі міжваеннай Польшчы і ўсходняй палітыкі. Важнай праблемай гісторыі знешняй палітыкі Польшчы ў міжваенны перыяд з’яўляецца так званы «праметэйскі» рух, гэта значыць канцэпцыя антысавецкага па характары супрацоўніцтва Польшчы з эмігранцкімі элітамі народаў СССР, якія імкнуліся да стварэння ўласных незалежных дзяржаў. Гістарыяграфія часоў ПНР прасоўвала вядомы тэзіс аб тым, што «праметэізм» – гэта праява польскага імперыялізму і не больш чым прыкрыццё для дзеянняў польскай разведкі на ўсходзе. На жаль, у польскай гістарыяграфіі няма сучасных глыбокіх даследаванняў, прысвечаных «праметэйскаму» руху. М. Корнат адзначае недахоп (за невялікім выключэннем) сучасных даследаванняў дзейнасці камуніс-

тычных партый у міжваеннай Польшчы і ўзаемадзеянне іх з Камінтэрнам [5, с. 780.]

У канцы 2000-х – пачатку 2010-х гг. паміж Расійскай Федэрацыяй і Польшчай назіралася палітычнае пацяпленне. У 2002 г. адбыўся візіт прэзідэнта Расійскай Федэрацыі У. У. Пуціна ў Польшчу. Па выніках сустрэч з кіраўніком Польшчы здзейснена спроба стварыць досыць спецыфічны для практыкі міждзяржаўных кантактаў механізм – Групу па складаных пытаннях, што вынікаюць з гісторыі польска-расійскіх адносін. Актыўная дзейнасць Групы пачынаецца толькі ў 2007 г. Дзяржавы Усходняй Еўропы сталі шмат увагі ўдзяляць гістарычнай палітыцы. Спрэчныя пытанні гісторыі ўплываюць на сучасныя міждзяржаўныя адносіны і выкарыстоўваюцца ўрадамі краін у якасці аргументаў у міжнароднай палітыцы. Кіраўніцтва Расійскай Федэрацыі і Польшчы прыйшло да высновы, што вырашаць спрэчныя пытанні гісторыі неабходна з улікам аргументаваных пазіцый навуковых апанентаў. Такім чынам, узнікла палітычная воля для расійска-польскага шчыльнага навуковага супрацоўніцтва.

Сустаршынямі Групы сталі рэктар Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін акадэмік А. В. Таркунова і прафесар, былы міністр замежных спраў Польшчы А. Д. Ротфельд. На першай сустрэчы 1–2 лютага 2008 г. у Бруселі сустаршыні абмеркавалі персанальны склад навуковага калектыву і кола пытанняў для вывучэння [6, с. 6]. У склад Групы, акрамя прафесійных гісторыкаў, увайшлі юрысты, работнікі следчых органаў, што займаліся катынскай справай, прадстаўнікі дзяржаўных архіваў і знешнепалітычных ведамстваў. Першае агульнае пасяджэнне Групы адбылося 12–14 чэрвеня 2008 г. у Варшаве. Урачыстае адкрыццё сустрэчы віталі міністр замежных спраў Польшчы Р. Сікорскі і пасол Расійскай Федэрацыі ў Польшчы У. М. Грынін [6, с. 7]. Другая сустрэча адбылася ў Маскве 27–28 кастрычніка 2008 г. На ёй быў распрацаваны план сумеснай грунтоўнай навуковай публікацыі. Абмеркаванне тэкстаў новай кнігі адбылося на трэцяй сустрэчы 28–29 мая 2009 г. у Кракаве. 1 верасня 2009 г. адбылася сустрэча прэм’ер-міністраў У. У. Пуціна і Д. Туска ў Сопаце, якая была ўспрынята ў тым ліку як пачатак карэннага пералому у ацэнцы агульнай польска-расійскай гісторыі. 9 лістапада 2009 г. на чацвёртым пасяджэнні Групы [6, с. 12] абмяркоўвалася публікацыя кнігі «Международный кризис 1939 г. в трактовках российских и польских историков» [7], падрыхтаванай Польскім інстытутам міжнародных пытанняў і Маскоўскім дзяржаўным інстытутам міжнародных адносін, адзначаны выхад спецыяльнага тэматычнага выпуску «Вестника МГИМО» з публікацыямі членаў Групы [8, с. 8]. Навуковая тэматыка даследаванняў вучоных Групы ахоплівала спрэчныя пытанні гістарыяграфіі савецка-польскіх адносін у перыяд і пасля заканчэння Другой сусветнай вайны, разнастайныя накірункі гістарычнай палітыкі. Пэўная ўвага была ўдзелена падзеям польска-савецкай вайны, 90-годдзе якой набліжалася. Асноўныя вынікі знайшлі ўвасабленне ў агульнай калектыўнай манаграфіі, якая была падрыхтавана

да 2010 г. Пасля красавіцкай трагедыі і сустрэч на вышэйшым узроўні ў 2010 г. супрацоўніцтва ў галіне сумесных гістарычных даследаванняў актывізавалася. Падчас візіта ў Расійскую Федэрацыю маршалка Сейма Браніслава Камароўскага было перададзена 67 тамоў завераных копій дакументаў, датычных катынскіх падзей. У 2017 г. была выдадзена грунтоўная калектыўная манаграфія – вынік работы Групы па складаных пытаннях «Белые пятна – черные пятна: Сложные вопросы в российско-польских отношениях» [8]. Пасля выдання кнігі дзейнасць Групы пачынае заміраць. У 2016 г. сустаршынёй Групы з польскага боку становіцца прафесар Міраслаў Філіповіч, дырэктар Інстытута Цэнтральнай і Усходняй Еўропы з Любліна. У 2018 г. дадзены інстытут быў расфарміраваны. Пасля некалькі разоў з вуснаў розных палітычных дзеячаў гучалі ідэі аб аднаўленні дзейнасці Групы [9], але рэальных навуковых даследаванняў пад яе эгідай больш не вялося.

Выданне «Белые пятна – черные пятна: Сложные вопросы в российско-польских отношениях» [8] складаецца з 16 тэматыка-храналагічных раздзелаў, кожны з якіх напісаны тандэмам польскага і расійскага гісторыкаў. Разгляд спрэчных пытанняў гісторыі Заходняй Беларусі 1918–1939 гг. тэматычна і храналагічна змешчаны ў раздзеле 1 «Начало» аўтарства Д. Ліпіньскай-Наленч, Т. Наленча і Г. Ф. Матвеева і раздзеле 2 «1920–1930-е годы в истории советско-польских отношений», падрыхтаваным В. Матэрскім і А. В. Равякіным. Аўтары дадзеных раздзелаў разглядаюць пытанні маскоўка-варшаўскай і еўрапейскай дыпламатыі і праблемы нацыянальных меншасцей фактычна не ўлічваюць [8, с. 15–126]. Беларускую тэматыку закранае разглядаемае аўтарамі планаванне польскай нацыянальнай палітыкі Ю. Пілсудскім і Р. Дмоўскім. Федэрацыйны план аднаўлення Польшчы Д. Ліпіньская-Наленч і Т. Наленч тлумачаць высакароднымі мэтамі Ю. Пілсудскага падтрымаць народы, што зведалі гнёт царызму. Аслабіўшы Расійскую імперыю і дабіўшыся з дапамогай Польшчы незалежнасці, удзячныя літоўцы і беларусы ўвойдуць у польска-беларуска-літоўскую унію. Толькі такім чынам, на думку Ю. Пілсудскага, дадзеныя народы могуць гарантаваць сваю бяспеку [10, с. 56]. Так, па версіі аўтараў, Ю. Пілсудскі апеляваў да ягелонскай ідэі. Польская нацыянальная гістарыяграфія даўно развянчала сацыялістычныя погляды маршалка і яго жаданне «дапамагчы» атрымаць незалежнасць літоўцам і беларусам. Расійскі гісторык Г. Ф. Матвееў звяртае ўвагу на тое, што Ю. Пілсудскі прыняў рашэнне самастойна вырашыць пытанне ўсходняй польскай граніцы, спрыяючы стварэнню на ўсход ад яе незалежных ад Расіі буферных літоўска-беларускай і ўкраінскай дзяржаў. Прычым даследчык падкрэслівае, што такое рашэнне было прынята маршалам ужо ў канцы 1918 г., калі ў яго не было яшчэ саюзнікаў з ліку ўплывовых украінскіх, літоўскіх і беларускіх палітыкаў [11, с. 29]. Але, на думку Г. Ф. Матвеева, заняцце польскімі войскамі Вільні ў красавіку 1919 г., гэта значыць сілавы варыянт вырашэння праблемы прыналежнасці горада, на які прэтэндавалі як палякі, так

і беларусы, і літоўцы, перакрэсліў шлях супрацоўніцтва Польшчы з беларускімі і літоўскімі элітамі [11, с. 32].

Няўдалая антысавецкая акцыя С. Булак-Балаховіча, пасля якой Польшча інтэрніравала яго салдат, названа спробай Пілсудскага з годнасцю растацца з пакінутым саюзнікам [10, с. 66].

В. Матэрскі коратка характарызуе такую з’яву, як праметэізм, і падкрэслівае, што ў 1930-я гг. дадзены прыём польскай міжнароднай палітыкі не насіў наступальнага характару [12, с. 120]. Дзейнасць Камуністычнай партыі Польшчы «і яе сатэлітаў» – Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і Камуністычнай партыі Заходняй Украіны – В. Матэрскі разглядае, у асноўным, у кантэксце іх ліквідацыі Савецкім Саюзам. Гісторык адзначае, што патэнцыяльныя магчымасці антыўрадавай дзейнасці польскіх камуністаў савецкім кіраўніцтвам выкарыстаны не былі па прычыне ўнутрыпартыйных супярэчнасцей і выкліканага імі недаверу з боку І. Сталіна [12, с. 124]. Таксама польскі даследчык звязвае ліквідацыю КПП з рэпрэсіямі супраць палякаў у СССР.

Праекты сумесных даследаванняў, арганізацыя якіх абумоўлена гістарычнай палітыкай, палітычнымі абставінамі, не маюць далёкай перспектывы, бо знікаюць са зменай палітычнага курса і адсутнасцю палітычнай волі. Тым не менш навуковае супрацоўніцтва з’яўляецца вельмі важным для абмену думкамі, літаратурай, прадстаўлення доступу да архіўных матэрыялаў. Вынікі навукова-арганізацыйнай работы Групы былі аформлены ў грунтоўную калектыўную манаграфію. Важна, што кожная з шаснаццаці спрэчных праблем гісторыі ў манаграфіі выкладзена ў артыкуле расійскага і польскага аўтара на адной мове. Трэба адзначыць, што навуковага кампрамісу ў большасці ацэнак польскім і расійскім гісторыкам дасягнуць не ўдалося. Сюжэты, якія б былі прысвечаны непасрэдна гісторыі Заходняй Беларусі, у згаданай манаграфіі адсутнічаюць. Асноўная думка расійскіх і польскіх даследчыкаў у дачыненні да беларусаў: беларусы не з’яўляліся суб’ектам гістарычных падзей, а фактычна паслужылі разменнай картай у расійска-польска-нямецкіх адносінах у 1918–1939 гг. Падобная думка, на жаль, працягвае панаваць у постсавецкай расійскай гістарыяграфіі. Сучасная польская гістарыяграфія, прысвечаная беларусам у складзе міжваеннай Польшчы, нашмат больш багатая і разнапланавая. Але сярод навуковых вынікаў работы польскіх вучоных Групы ўсё роўна сустракаюцца тэндэнцыйныя і міфалагізаваныя погляды і ацэнкі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Савич, А. А.* Белорусско-польские противоречия в коммунистическом движении Западной Белоруссии в 1920–1930-х годах: историография и перспективы исследования // Славяноведение. – 2020. – № 3. – С. 15–24.

2. *Загідулін, А. М.* Нацыянальная палітыка міжваеннай Польшчы: некаторыя варыянты інтэрпрэтацыі ў расійскай і ўкраінскай гістарыяграфіях / А. М. Загідулін // Веснік

Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Сер. 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія. – 2023. – № 1 (15). – С. 69–74.

3. *Торкунов, А. В.* Размышления о прошлом с мыслью о будущем / А. В. Торкунов, А. Д. Ротфельдт // Белые пятна – черные пятна: Сложные вопросы в российско-польских отношениях / под общ. ред. А. В. Торкунова, А. Д. Ротфельда. – М.: Аспект Пресс, 2017. – С. 5–15.

4. *Яжборовская, И. С.* Современная историография российско-польских отношений / И. С. Яжборовская // Белые пятна – черные пятна: Сложные вопросы в российско-польских отношениях / под общ. ред. А. В. Торкунова, А. Д. Ротфельда. – М.: Аспект Пресс, 2017. – С. 737–767.

5. *Яжборовская, И. С.* Россия и Польша. Синдром войны 1920 г. / И. С. Яжборовская, В. С. Парсаданова. – М.: Академия, 2005. – 404 с.

6. *Корнат, М.* Современная историография российско-польских отношений / М. Корнат // Белые пятна – черные пятна: Сложные вопросы в российско-польских отношениях / под общ. ред. А. В. Торкунова, А. Д. Ротфельда. – М.: Аспект Пресс, 2017. – С. 767–815.

7. Международный кризис 1939 года в трактовках российских и польских историков / М. Волос [и др.]; под ред. М. М. Наринского и С. Дембского; пер. Н. В. Селиванова. – М.: Аспект Пресс, 2009. – 480 с.

8. Белые пятна – черные пятна: Сложные вопросы в российско-польских отношениях / под общ. ред. А. В. Торкунова, А. Д. Ротфельда. – М.: Аспект Пресс, 2017. – 823 с.

9. Польша готова возобновить работу Группы по сложным вопросам [Электронный ресурс] // РИА Новости. – 21.01.2020. – Режим доступа: https://ria.ru/20200121/1563672576.html. – Дата доступа: 20.10.2023.

10. *Липиньская-Наленч, Д.* Начало / Д. Липиньская-Наленч, Т. Наленч // Белые пятна – черные пятна: Сложные вопросы в российско-польских отношениях / под общ. ред. А. В. Торкунова, А. Д. Ротфельда. – М.: Аспект Пресс, 2017. – С. 50–73.

11. *Матвеев, Г. Ф.* Начало / Г. Ф. атвеев // Белые пятна – черные пятна: Сложные вопросы в российско-польских отношениях / под общ. ред. А. В. Торкунова, А. Д. Ротфельда. – М.: Аспект Пресс, 2017. – С. 15–50.

12. *Матерский, В.* 1920–1930-е годы в истории советско-польских отношений / В. Матерский // Белые пятна – черные пятна: Сложные вопросы в российско-польских отношениях / под общ. ред. А. В. Торкунова, А. Д. Ротфельда. – М.: Аспект Пресс, 2017. – С. 103–126.

**(Дата падачы: 12.02.2024 г.)**